

# Веды пакаленняў

Бібліятэка — гэта не толькі месца, дзе “жывуць” кнігі. Гэта заўсёды культурна-інтэлектуальны цэнтр для горада ці вёскі. Архітэктура Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі нездарма нагадвае брыльянт. Веды, культура, гісторыя — гэта насамрэч самая вялікая каштоўнасць.

## Мультыцэнтр і візітная картка Мінска

Мне здалося, што шмат моладзі прыходзіць у “нацыяналку” не толькі дзеля кніг. Тут, як высветлілася, можна глядзець і слухаць кіно, музыку і г.д. не толькі ў запісе, але і анлайн – інтэрнэт бясплатны, у індывідуальных кабінках магутныя кампутары і зручныя крэслы. А яшчэ ёсць фізкультурна-аздараўленчы комплекс, зручнасць і даступнасць якога ацанілі не толькі работнікі бібліятэкі, але і жыхары суседніх вуліц. Тут і трэнажорная зала, і саўна з масажам – найлепшае выратаванне ад гарадскіх стрэсаў.

У бібліятэцы ёсць і свой “музычны пакойчык” з піяніна. Захоўваць цішыню тут катэгарычна забараняецца. Можна іграць, колькі душы заўгодна. Тым больш у суседняй зале нотных і аўдыявізуальных дакументаў ёсць рэдкія кампазіцыі і альбомы на панеры, калекцыя з 17 тысяч вінілавых пласцінак. Сапраўдны райскі куток для меламанаў. Музыка ёсць любы густ: ад меланхалічнага «Месяцовага святла» Дэбюсі да запальнага Майкла Джэксана.

Яшчэ ў Нацыянальнай бібліятэцы ёсць 4 мастацкія галерэі – з-за іх прасторныя холы будынка нагадваюць музей сучаснага мастацтва. Ёсць на што паглядзець.

– Абнаўляем кампазіцыі раз на паўтара месяца, – кажа бібліятэкар аддзела абслугоўвання спецыяльных фондаў Людміла Клімава. У галерэі «Лабірынт» зараз выстаўка



Хрысціна ХІЛЬКО
Фота Віталія ПІВАВАРЧЫКА

скульптара Максіма Петруля. Але не скульптур, а фотапартрэтаў дзеячаў культуры і мастацтва. Часам у бібліятэку прыходзяць менавіта дзеля экспазіцый. Увосень будзем рабіць праект, прысвечаны Францыску Скарыну. Бо сёлета святкуем 500-годдзе выдання нашым славутым земляком першай кнігі для ўсходніх славян.

Знаходкай для мяне стаў дзіцячы пакой на першым паверсе. Цяпер маладыя мамы могуць цалкам пасвяціць сябе навуцы, пакуль дзеткі пад наглядам выхавальніц. Яны пагуляюць з малымі ў развіваючыя гульні, пачытаюць кнігі ці паглядзяць добрае кіно.

Наш гід Людміла Клімава тлумачыць, што паслугу «дзіцячага пакоя» ў сценах бібліятэкі паспелі ацаніць многія чытачкі: цяпер можна спакойна рыхтавацца да іспытаў, займацца навукай, павышаць свой узровень, ведаючы, што тваё дзіця побач пад наглядам вопытных педагогаў.

## Музей кнігі: ад старажытнасці да сучаснасці

Музеі ў бібліятэках – практыка, распаўсюджаная па ўсім свеце, кажа Людміла Клімава. На рукі чытачу выдаюцца кнігі, не старэйшыя за 1830 год. І дзе ж яшчэ ўбачыш Біблію беларуса Скарыны, якую ён надрукаваў у Празе 500 гадоў таму! У музеі рарытэты кнігадрукавання даступныя ўсім – за год музей наведвае больш за 15 тысяч чалавек.





Беларусам грэюць душу кнігі з калекцый Радзівілаў – найбагацейшага роду Вялікага Княства Літоўскага. Яны не толькі прывозілі ў Нясвіж найлепшыя ўзоры літаратуры, але і самі складалі, даследавалі, малявалі. Літаратурны здабытак магнатаў унесены ў сусветны спіс спадчыны ЮНЕСКА "Памяць сусвету". Чаго толькі вартыя ноты оперы "Фауст» Антонія Херніка Радзівіла!

Гасцей не адарваць ад аддзела старажытных кніг. У іх вокладкі з драўляных дошак, абцягнутых скурай або тканінай. Аклады раскошных Евангелляў з муаравай тканіны ўпрыгожваюць пазалочаныя зашпількі.

Музей кніг – гэта і гісторыя Беларусі: тут сабраны старажытныя татарскія кітабы, зборнікі спеваў старавераў, манускрыпты з арабскай вяззю.

А дзеці больш за ўсё любяць разглядаць калекцыю мініяцюрных кніг. Вось зборнік Пушкіна памерам з тэлефонную "сімку", а вось сачыненні Коласа, якія чытаюцца толькі пад лупай.

У фондах галоўнай бібліятэкі краіны звыш 9 млн асобнікаў друкаванай прадукцыі, якія займаюць 10 паверхаў.

– У адкрытым доступе больш за паўмільёна асобнікаў. У нас адна з самых высокіх хуткасцяў дастаўкі кніг карыстальніку – 10-20 хвілін. Напрыклад, у парыжскай бібліятэцы Мітэрана чытач чакае заказаную кнігу каля гадзіны.

Напрыканцы экскурсіі мы падняліся на аглядную пляцоўку "дыямента" – адну з найлепшых у Мінску: горад як на далоні. Акрамя пляцоўкі, на 22-м паверсе бібліятэкі вельмі ўтульная кавярня, дзе за кубачкам кавы можна пагутарыць з сябрамі, а замежных гасцей пачаставаць дранікамі.

Будынак бібліятэкі познім вечарам – гэта нешта неверагоднае! Ён ператвараецца ў святлодыёдны экран, на якім зіхацяць карціны з 65 тысячамі адценняў усіх колераў вясёлкі.








***Запрашаем!***

Калі Вы яшчэ не былі ў Нацыянальнай бібліятэцы, абавязкова выпраўляйце становішча. Кошт білета чытача ўсяго 35900 рублёў. У бібліятэку можна прайсці і па разавай картцы сацыякультурнага цэнтра (без доступу ў чытацкія залы). Картка дзейнічае адзін дзень. Аформіць білет або картку можна па дакуменце, які пацвярджае асобу.